## Білет 18

**Практычнае заданне.**
**Культура Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. Умовы і асаблівасці фарміравання беларускай нацыі.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Дзе на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. можна было атрымаць педагагічную адукацыю?
2. Якім чынам студэнты-гоманаўцы абгрунтоўвалі існаванне беларускай нацыі?
3. Пра якія прыкметы нацыі гаворыцца ў прыведзеных фрагментах твораў Францішка Багушэвіча і Янкі Купалы?
4. Ці можна сказаць, што беларускія паэты другой паловы XIX – пачатку XX ст. спрыялі фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці беларусаў? Сваё меркаванне растлумачце.

**I. Установы адукацыі на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX - пачатку XX ст.**




**II. З твораў беларускіх паэтаў другой паловы XIX – пачатку XX ст.**

*З прадмовы да зборніка “Дудка беларуская” Францішка Багушэвіча*

“…Браткі мілыя, дзеці Зямлі-маткі маёй! Вам ахвяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую…“мужыцкай” завуць, а завецца яна “беларускай”. Шмат было такіх народаў, што страцілі наперш мову сваю, так, як той чалавек перад скананнем, катораму мову займе, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!..”.

*З верша Янкі Купалы "А хто там ідзе?"*

А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?
– Беларусы...
А чаго ж, чаго захацелась ім,
Пагарджаным век, ім, сляпым, глухім?
– Людзьмі звацца.

**III. Аб фарміраванні беларускай нацыянальнай ідэі** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка “Гісторыя Беларусі. Канец XVIII - пачатак XX ст. 8 клас»)*

Разам з паступовым фарміраваннем беларускай нацыі зараджалася беларуская нацыянальная ідэя – уяўленні пра беларусаў як самастойнай і самабытнай супольнасці людзей з уласнымі жыццёва важнымі інтарэсамі. Тэарэтычнае абгрунтаванне самастойнага існавання беларускага этнасу ўпершыню далі беларускія студэнты-гоманаўцы.

У 1884 годзе студэнты – ураджэнцы Беларусі стварылі ў Пецярбургу групу «Го́ман». Яе ўзначалілі Аляксандр Марчанка і Хаім Ратнер. Свае задачы і праграму яны выклалі ў двух нумарах нелегальнага часопіса “Гоман”. Гоманаўцы першымі з рэвалюцыянераў заявілі аб існаванні беларускай нацыі і паставілі пытанне аб яе нацыянальна-дзяржаўнай самастойнасці. Нацыя ўяўляе сабой гістарычную супольнасць людзей, для якой характэрны пражыванне на адной тэрыторыі, устойлівыя эканамічныя сувязі, літаратурная мова, агульныя рысы культуры і псіхалогіі, у тым ліку нацыянальная самасвядомасць і імкненне да ўласнай дзяржаўнасці.

Студэнты-гоманаўцы даказвалі, што беларускі народ мае сваю мову, тэрыторыю, культуру, побыт, гістарычнае мінулае, а Беларусь уяўляе сабой цэласны эканамічны рэгіён.

Будучую дзяржаўнасць Беларусі гоманаўцы бачылі ў саюзе з сацыялістычнай Расіяй. Яны выступалі за аўтаномію Беларусі ў складзе дэмакратычнай і федэратыўнай Расіі. У 1905 г. гоманаўскую ідэю падхапілі прыхільнікі БСГ, распрацаваўшы палажэнне аб неабходнасці нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай дзяржавы.